УДК 37.01(476) (092)+929 Бельскі

**А.І. Бельскі** (Мінск),
**Т.П. Яталь** (Кіеў)

# РАЗВІЦЦЁ ІНДЫВІДУАЛЬНАГА ТВОРЧАГА ПАТЭНЦЫЯЛУ ЯК МАТЫВАЦЫЙНАЯ ЎМОВА БЕСПЕРАПЫННАЙ АДУКАЦЫІ АСОБЫ (на прыкладзе педагагічнай дзейнасці Ф.А. Бельскага)

**Анатацыя.** У артыкуле асвятляецца прафесійна-педагагічная дзейнасць Ф.А. Бельскага ў напрамку працы з адоранымі дзецьмі, яго адукацыйная практыка праз індывідуалізацыю і развіццё творчых здольнасцей студэнтаў. Ён лічыў, што ўсебаковае развіццё асобы (інтэлектуальнае, маральнае, культурнае), раскрыццё яе творчага патэнцыялу з'яўляецца важным, ключавым фактарам фарміравання адукацыйнага асяроддзя, умовай стварэння крэатыўнага і прагрэсіўнага грамадства.

**Ключавыя словы:** адоранасць, Ф.А. Бельскі, дзейнасць, матывацыя, развіццё, творчыя здольнасці, творчы патэнцыял, дзеці, навучэнцы, студэнты, моладзь, літаратурныя і навуковыя гурткі.

**Summary.** The article focuses on the professional and pedagogical activities of F.A. Belsky in the field of working with gifted children and his educational practice involving individualization and development of students' creative abilities. He believed that comprehensive development of the individual (intellectual, moral, cultural), releasing of his/her creative potential is a key factor in the formation of the educational environment, a condition for building a creative and progressive society.

**Keywords:** talent, F.A. Belsky, activity, motivation, development, creative abilities, creative potential, children, pupils, students, youth, literary and scientific circles.

Адукацыя і навучанне на працягу жыцця – стратэгія, якая з'яўляецца адным з галоўных трэндаў у сучаснай Еўропе і свеце, у тым ліку і на постсавецкай прасторы, дзе адбываецца збліжэнне і карэляцыя адукацыйных сістэм на розных узроўнях, прычым асабліва прыкметна ў рамках Балонскіх пагадненняў. Рэфрэнам на многіх прадстаўнічых формумах апошняга часу праходзіць думка пра неабходнасць індывідуальна арыентаванага выяўлення і развіцця творчага патэнцыялу асобы. На навукова-педагагічнай канферэнцыі «Навукова спадщина Василя Сухомлиньского у контексті розвитку освіти особистості впродовж життя» (2016) адзначалася, што «для незалежнай Украіны праблема развіцця творчых здольнасцей, актывізацыя творчай



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

дзейнасці яе грамадзян набывае прыярытэтнае значэнне» [6, с. 96]. Ідэя бесперапыннай адукацыі стала сацыяльна значным прыярытэтам і педагагічнай стратэгіяй у нашай краіне, як і вызначальнай з’яўляецца арыентацыя на творчы характар дзейнасці і самаразвіццё асобы ва ўмовах сучаснай адукацыі.

Абуджаць, падтрымліваць крэатыўныя здольнасці, рыхтаваць да жыцця творчага чалавека – задача не новая. Пагодзімся, «крэатыў здольны сам бачыць і ставіць задачы, імкнецца выйсці за рамкі вузка пастаўленай мэты… Творчасць – дзейнасць, якая мае вынікам стварэнне нечага прынцыпова новага. Аднак вытокі ўсякай навацыі – у традыцыі [2, с. 120–121]. Таму актуальнай задачай з’яўляецца зварот да філасофска-культурнага і педагагічнага вопыту мінулага, да напрацаваных папярэднікамі ідэй і традыцый. Шырока разумеў творчасць беларускі мысляр І. Канчэўскі (Абдзіраловіч), які пісаў: «Сапраўднай падставай жыцця можа быць толькі творчасць. Творчасць на кожным кроку: у штодзённай працы, у сямейных адносінах, у грамадзянскім руху…» [1, с. 26].

Праблема інтэлектуальна-духоўнага, творчага развіцця дзяцей і моладзі займала прафесара педагогікі Фаму Антонавіча Бельскага (1890–1952) яшчэ ў 20-я гг. мінулага стагоддзя, пра што, уласна кажучы, засведчылі яго працы «Вывучэнне здольнасцей дзяцей», «Арганізацыя школ для адораных дзяцей» (абедзве – 1927) і інш. Вучоны арыентаваў педагогаў і бацькоў на «вывучэнне здольнасцей дзяцей з мэтай выяўлення іх разумовага, маральнага, культурнага развіцця» [7, с. 21], лічыў, што прагрэсу грамадства «ў значнай ступені дапамогуць найбольш адораныя людзі, якія атрымліваюць на школьнай лаўцы стымулы да развіцця сваіх асаблівых талентаў» [7, с. 20]. Усведамляў Ф. А. Бельскі неабходнасць пастаяннай самаадукацыі настаўнікаў, стымулаў для росту іх прафесійна-педагагічнай і агульнай культуры, бо менавіта ад гэтага залежыць якасць адукацыі і паспяховаць падрыхтоўкі маладога пакалення да самастойнага жыцця і дзейнасці (артыкул «Мэтанакіраванасць у самаадукацыі настаўніцтва», 1927).

Несумненную навуковую каштоўнасць маюць педагагічныя погляды і падыходы Ф.А. Бельскага, якія асэнсаваны апошнім часам даволі грунтоўна [4; 5; 9]. Асаблівую цікавасць уяўляе ўласная прафесійна-педагагічная дзейнасць вучонага ў рэчышчы працы з адоранымі дзецьмі, яго адукацыйная практыка праз індывідуалізацыю і развіццё творчых здольнасцей студэнтаў. У гэтай сувязі варта прывесці слушную, красамоўную думку знакамітага В.А. Сухамлінскага: «Калі вы хочаце духам творчага пошуку ўзбагаціць жыццё калектыву, будзьце самі шукальнікам і даследчыкам» [8, с. 471].

Менавіта педагогам, які спалучаў тэорыю і практыку, і быў Фама Антонавіч Бельскі, гімназічны і школьны настаўнік, а пазней выкладчык у розных вышэйшых навучальных установах былога Савецкага Саюза. Трэба заўважыць, што ў дзяцінстве ён сам быў адораным дзіцем. У час вучобы ў народным вучылішчы, а пазней – у Слуцкай гімназіі юны Фама вызначаўся ў паэтычнай дэкламацыі, ён практыкаваўся ў вершаванні, складаў невялікія аповеды. Творчы дар яму, можна сказаць, перадаўся па спадчыне. Яго дзед Сільвестр Бельскі быў выпускніком літаратурнага факультэта Віленскага ўніверсітэта, вучыўся ў ім, дарэчы, у эпоху Міцкевіча, філаматаў і філарэтаў. Не захаваліся ні літаратурныя трактаты іераманаха Сільвестра Бельскага, ні сшыткі з вершамі самога Фамы Антонавіча. Можна толькі спадзявацца на нейкі цуд, раптоўнае адкрыццё. Магчыма, што-небудзь з літаратурных опусаў студэнта Сільвестра Бельскага ляжыць і чакае сваёй пары ў архівах Віленскага ўніверсітэта. У самым пачатку Вялікай



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Айчыннай вайны бомба трапіла ў чарнігаўскі дом Бельскіх, у полымі згарэлі паэтычныя сшыткі Фамы Антонавіча. Не выключана, што асобныя яго творы былі надрукаваны ў якіх-небудзь перыядычных выданнях.

Фама Антонавіч Бельскі – настаўнік і выхавальнік юных талентаў і творчай моладзі. Гэта вельмі важны аспект яго педагагічнай, выхаваўчай дзейнасці, заснаванай у значнай ступені на грамадскай, дабраахвотнай аснове. У 1913 г. пасля заканчэння Імператарскага ўніверсітэта св. Уладзіміра з дыпломам першай ступені Ф. Бельскі быў накіраваны на працу ў мястэчка Златапаль Чыгірынскага павета Кіеўскай губерні. У мясцовай мужчынскай гімназіі ён пачаў выкладаць рускую мову і славеснасць. Гэта быў вельмі плённы перыяд яго прафесійнай дзейнасці, які доўжыўся амаль пяць гадоў, выключаючы час знаходжання на Каўказскім фронце. Спачатку Ф. Бельскі праводзіў з навучэнцамі заняткі па дэкламацыі, рыхтаваў інсцэніроўкі святаў, ставіў тэатральныя пастаноўкі. Неўзабаве яго напаткалі першыя поспехі, а гэта стымулявала натхненне і актыўнасць. Заняткі Фамы Антонавіча карысталіся ў гімназістаў асаблівай папулярнасцю, да маладога выкладчыка прыйшлі павага і аўтарытэт. Затым пазакласная дзейнасць выйшла на новы ўзровень. У 1915 г. Ф. Бельскі стварыў «Гурток аматараў славеснасці Златапальскай мужчынскай гімназіі». У гэты час тут ужо працаваў Мікола Зэраў, яго ўніверсітэцкі таварыш і малады літаратар, што спрабаваў свае творчыя сілы ў крытыцы і мастацкім перакладзе. Ф. Бельскі з натхненнем узяўся за працу з адоранымі навучэнцамі. Сам ад прыроды таленавіты чалавек, ён, стаўшы на выкладчыцкую сцежку, імкнуўся запаліць у дзецях іскрынку натхнення, накіраваць іх на раскрыццё творчых здольнасцей, паэтычнага таленту. Пра гэта пазней успамінаў Аляксандр Філіповіч, былы вучань Ф.А. Бельскага і родны брат вядомага ўкраінскага паэта Паўла Філіповіча: «Выкладчык літаратуры ў нашай гімназіі Фама Антонавіч Бельскі стварыў у пачатку 1915 г. гурток “Аматараў славеснасці”, мэтай якога было паглыбленае вывучэнне літаратуры шляхам наладжвання так званых літаратурных судоў (з іх памятаю два над вядомымі персанажамі расійскай літаратуры: Анегіным і Пячорыным), спектакляў і чытання рэфератаў на літаратурныя тэмы. У яго склад уваходзілі навучэнцы, якія мелі схільнасць да літаратурнай творчасці (было іх каля 25 чалавек), а з выкладчыкаў, акрамя кіраўніка гуртка, толькі адзін быў яго сябрам – М.К. Зэраў ... Гурток выдаваў свой “орган” – невялікія друкаваныя зборнікі пад назвай “На шляху да мастацтва”» [10, с. 132–133]. Апрача вершаваных радкоў гімназістаў, у адным са зборнікаў быў надрукаваны першы пераклад М. Зэрава верша французскага паэта Леконт дэ Ліля «Антычны медаль». Свае ўспаміны А. Філіповіч напісаў на эміграцыі, апублікаваў іх у зборніку «Безсмертні» (1963), які выйшаў у Мюнхене [3]. У гэтым выданні мы знайшлі на ўклейцы фотакопію вокладкі зборніка «На пути к искусству», выдадзенага пад рэдакцыяй Ф. Бельскага ў Златапалі ў студзені 1918 г. у друкарні Л. Бяляева. На вокладцы ў якасці эпіграфаў змешчаны радкі нямецкага пісьменніка Ф. Гебеля і рускага паэта А. Плешчэева. Тое, што зборнік літаратурнага гуртка Аляксандр Філіповіч у час вайны павёз з сабой з Украіны на эміграцыю, кажа пра тое, наколькі значным і каштоўным было гэта выданне для яго, былога златапальскага гімназіста.

Фама Антонавіч на занятках з паэтычна адоранымі дзецьмі прышчапляў эстэтычны густ на аснове лепшых мастацкіх узораў. Ён вылучаў у літаратурных творах глыбокія думкі, цытаваў вершаваную афарыстыку, даваў парады, як дасягнуць



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

найбольш пранікнёнага і вобразнага самавыяўлення. Асабліва яму імпанавалі радкі В. Жукоўскага: «*Поэзия есть Бог* в *святых мечтах* земли». Трэба адзначыць, што Фама Антонавіч жыў з паэзіяй у сэрцы ўсё сваё жыццё. Ён любіў вершы згаданых Пляшчэева і Жукоўскага, Лермантава і Цютчава, рускую паэзію Сярэбранага веку, у арыгінале чытаў Адама Міцкевіча, па-французску – Верлена, часта ўслых цытаваў Гейне.

У савецкі час, калі пачалася пралетарызацыя свядомасці і грамадства, перастала як інстытуцыя існаваць гімназія. Ф. Бельскі быў прызначаны загадчыкам Златапальскай працоўнай школы № 2. Новая эпоха станаўлення рабоча-сялянскай улады ўяўляла сабой адметны культурны феномен. На Данбасе незвычайна актывізавалася і палітызавалася грамадскае жыццё, ўзнікалі новыя формы сацыяльных паводзінаў і стасункаў. Праходзілі бурныя сходы і мітынгі, ствараліся розныя таварыствы, секцыі, гурткі. Ф. Бельскі ўключыўся ў гэты актыўны працэс пераменаў і трансфармацыі, быў уцягнуты ў новыя пераўтварэнні ў галіне народнай адукацыі і культуры. Ён актыўна ўдзельнічаў у арганізацыі навуковых аб’яднанняў, культурных устаноў: Луганскай секцыі навуковых работнікаў, Сацыяльнага музея Данбаса і інш. Гісторык і краязнаўца Т. Анпілогава знайшла ў архівах звесткі, што Фама Бельскі некаторы час кіраваў працай літаратурнага гуртка «Забой» [5, с. 88]. Хутчэй за ўсё, гэты гурток быў спалучаны з аб’яднаннем творчай інтэлігенцыі «Забой», першым старшынёй якога быў рэдактар «Луганской правды» А. Селіваноўскі. Ф. Бельскі выступаў з публікацыямі на старонках газеты, у друкарні «Луганской правды» выйшлі дзве ягоныя кніжкі. Працуючы прафесарам Данецкага інстытута адукацыі, ён надаваў пільную ўвагу працы са студэнцкай літаратурнай моладдзю, падняў пытанне аб стварэнні асаблівых умоў для таленавітых навучэнцаў.

Дзе б ні працаваў Фама Антонавіч, ён імкнуўся аб’ядналь творчыя маладыя сілы, спрыяў развіццю індывідуальных схільнасцей навучэнцаў або студэнтаў. У 1935–1936 гг. прафесар Ф. Бельскі выкладаў на літаратурным факультэце Магілёўскага педінстытута, тут ён зблізіўся на творчай глебе з літаратуразнаўцам І. Гутаравым. Фама Антонавіч прысутнічаў на пасяджэннях і сходах творчай моладзі, якія праходзілі ў інстытуце і рэдакцыі газеты «Камунар Магілёўшчыны». У адным з лістоў да сястры Яўгеніі, народжанай у Беларусі і якая жыла ў Кіеве, ён жартаўліва пісаў, што «с воодушевлением слушал стихи детей Купалы и Гуторова» – так ён пісаў, маючы на ўвазе пачаткоўцаў і маладых інстытуцкіх паэтаў.

У гады Вялікай Айчыннай вайны Ф.А. Бельскі, працуючы ў Бухарскім педінстытуце, шмат часу надаваў працы з навуковай і творчай моладдзю. З архіўных крыніц стала вядома, што ён стварыў у інстытуце навуковы гурток па педагогіцы, у якім студэнты Бурнашава, Кантароўская, Рахманаў, Цяцюшаў, Часнакова, Хакімаў займаліся даследчай дзейнасцю, вывучалі розныя праблемы адукацыі і выхавання [падрабязней гл.: 9, с. 134–136]. Прафесар выступаў з навуковымі дакладамі ў гуртку, уласным прыкладам захапляў у свет ведаў, паказваў, як трэба структураваць працэс даследавання тэмы ці праблемы, як неабходна публічна выкладаць думкі і меркаванні. Часткай працы гуртка з’яўляліся сустрэчы з вядучымі педагогамі-практыкамі са школ Бухары, правядзенне студэнцкіх навуковых чытанняў.

У Ленінградскім абласным настаўніцкім інстытуце пад кіраўніцтвам Ф.А. Бельскага на працягу 1947–1951 гг. працаваў студэнцкі гурток па псіхалогіі і



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

педагогіцы. На яго пасяджэннях заслухоўваліся даклады, паведамленні, рэфераты, абмяркоўваліся актуальныя навуковыя пытанні і праблемы.

Як можна пераканацца, Фама Антонавіч Бельскі быў не толькі вучоным-даследчыкам у галіне адукацыі, а і педагогам-выхавальнікам, апекуном юных талентаў, арганізатарам актыўнай дзейнасці студэнцкіх літаратурных і навуковых гурткоў. Ён у першую чаргу клапаціўся пра творчае развіццё дзяцей і навучэнцаў, іх прыродных задаткаў і здольнасцей. Усведамляў неабходнасць выхавання непаўторнай індывідуальнасці і фарміравання прафесійнай культуры будучага педагога, здольнага эфектыўна і прадуктыўна наладжваць дзейнасць у тагачасных установах адукацыі. Вучоны-практык не шкадаваў часу на працу з адоранымі навучэнцамі, найбольш матываванымі студэнтамі, бо, лічыў ён, самае галоўнае ў асобе – яе індывідуальны творчы патэнцыял, інтэлект, эстэтычная культура і маральная аснова. Ён быў перакананы, што ў грамадстве наперадзе павінен ісці чалавек адукаваны і творчы, чалавек, які духоўна ўзбагачае сябе навуковымі ведамі, мастацтвам, культурнымі дасягненнямі свайго народа і чалавецтва.

### Літаратура


1. Абдзіраловіч, І. Адвечным шляхам: дасьледзіны беларускага сьветагляду / І. Абдзіраловіч. – Мінск : Навука і тэхніка, 1993. – 44 с.
2. Акадэмік М. А. Лазарук і праблемы літаратурнай адукацыі ў Беларусі: матэрыялы рэспубл. мемарыяльных навук. чытанняў «Навукова-педагагічная і літаратуразнаўчая спадчына акадэміка М. А. Лазарука», Мінск, 4 кастр. 2001 г. / рэдкал.: А. І. Бельскі (адк. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2003. – 296 с.
3. Безсмертні : зб. спогадів про М. Зерова, П. Филиповича і М. Драй-Хмару / Ін-т літ. ім. М. Ореста ; ред. текстів та прим. М. Ореста. – Мюнхен, 1963. – *334*, VII с.
4. Жигалова, М. П. **Педагогическое наследие Ф. А. Бельского /** М. П. Жигалова // Адукацыя і выхаванне. – 2016. – № 6. – С. 74–78.
5. І прызванне, і лёс: жыццё і дзейнасць вучонага-педагога прафесара Фамы Антонавіча Бельскага / уклад. і камент. А. І. Бельскага ; прадм. У. Т. Кабуша. – Мінск : Рэдакцыя часопіса «Роднае слова», 2012. – 143 с.
6. Наукова спадщина Василя Сухомлинського у контексті розвитку освіти особистості впродовж життя : зб. матеріалів Всеукр. наук.-метод. конф., присв. 98-річчю від дня народження В. Сухомлинського, 28–29 вер. 2016 р. / уклад О. Е. Жосан. – Кропивницький: Ексклюзив-систем, 2016. – 412 с.
7. Прафесар Фама Антонавіч Бельскі = Профессор Фома Антонович Бельский / уклад. А. І. Бельскі. – Мінск : Энцыклапедыкс, 2002. – 38 с.
8. Сухомлинський, В. О. Вибрані твори : у 5 т. / В. О. Сухомлинський. — Київ : Рад. шк., 1977. – Т. 5 : Статті. – 639 с.
9. Фама Антонавіч Бельскі: біягр. матэрыялы і артыкулы = Фома Антонович Бельский: биогр. материалы и статьи / уклад., прадм. і камент. А. І. Бельскага. – Мінск : Выдавец Зміцер Колас, 2015. – 223 с.
10. Филипович, О. Златопільські роки в житті М. К. Зерова / О. Филипович // Київські неокласики / упоряд. В. Агеєва. – Київ : Факт, 2003. – С. 131–136.




Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова